2. *Буткевич, В. В.* Патриотическое воспитание учащихся: история и современность / В. В. Буткевич. — Минск : Нац. ин-т образования, 2010. — 208 с.
3. *Зубко, Д. П.* Современные аспекты воспитания патриотизма и гражданственности / Д. П. Зубко // Праблемы выхавання. — 2005. — № 1. — С. 12—16.
4. Учебная программа дошкольного образования / М-во Респ. Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2023. — 380 с.
5. *Петрикевич, А. А.* Метод проектов в образовании дошкольников : пособие для педагогов учреждений, обеспечивающих получениие дошкол. образования / А. А. Петрикевич. — Мозырь : Белый ветер, 2008. — 102 с.
УДК 378

**Шыман Наталля Аляксандраўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячы сад аг. Ёдкі», аг. Ёдкі, Рэспубліка Беларусь, edki-detsad@edu-lida.gov.by*

# ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ПАЧУЦЦЯЎ У ДАШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ДАПАМОЗЕ АЗНАЯМЛЕННЯ З ГІСТОРЫЯЙ І КУЛЬТУРАЙ РОДНАГА КРАЮ

У рабоце падымаецца праблема выхавання патрыятычных пачуццяў у дашкольнікаў. Апісваецца вопыт работы выхавальніка дашкольнай адукацыі па выхаванню патрыятычных пачуццяў у дашкольнікаў пасродкам азнаямлення з гісторыяй і культурай роднага краю. Прадстаўлены эфектыўныя метады і прыёмы, якія дапамогуць педагогу фарміраваць уяўленні аб родным краі і яго гісторыі ў дляцей дашкольнага ўзросту, вырашаць задачы Вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. (адукацыйнага стандарта).
**Ключавыя словы:** дашкольнік; патрыятычнае выхаванне; гісторыя і культура роднага краю.

**Shuman Nataliya Aleksandrovna**
*Kindergarden ag. Yodki, ag. Yodki, the Republic of Belarus, edki-detsad@edu-lida.gov.by*

# FOSTERING FEELINGS OF PATRIOTISM AMONG PRESCHOOLERS THROUGH FAMILIARIZATION WITH THE HISTORY AND CULTURE OF THEIR NATIVE LAND

The article raises the problem of fostering feelings of patriotism among preschoolers. The article describes the experience of a preschool teacher in raising patriotic feelings among preschoolers through familiarization with the history and culture of their native land. There are presented effective methods and techniques that will help an educator to acquaint preschoolers with their native land and its history, to solve the tasks of the preschool curriculum. (educational standard).
**Key words:** preschooler; patriotic education; the history and culture of the native land.

**Уводзіны.** Прыйдзе час, і сённяшнія дашкольнікі будуць вызначаць будучыню роднай Беларусі. І вельмі важна ўжо зараз звярнуць увагу на выхаванне ў падрастаючага пакалення пачуцця патрыятызму, выхавання асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, у цэнтры якой будзе ўсведамленне ўласнай адказнасці за лёс Радзімы.

Пачуццё патрыятызму шматграннае і змястоўнае: гэта лбюбоў да сваіх блізкіх і гонар за ўвесь беларускі народ, яскравыя ўспаміны пра месца, дзе нарадзіўся, і павага да сваёй Радзімы, жаданне берагчы яе, садзейнічаць яе росквіту.

Павага да Радзімы фарміруецца паступова ў працэсе назапашвання ведаў аб грамадскім жыцці, працы людзей на карысць краіны, прыродзе, народных традыцыях [1, с. 3].

Грымаць А. А. адзначае: «Радзіма — гэта тое, да чаго чалавек не можа адносіцца абыякава, гэта тое асяроддзе, у якім ён жыве, дзе яго чалавечыя карані знаходзяць спрыяльныя ўмовы для свайго развіцця. Без ведання гісторыі свайго роду, суадносін з гісторыяй месца, дзе яно жыве, дзіцяці цяжка адчуць, зразумець сэнс паняцця «Радзіма». Радзіма як найвышэйшая духоўная каштоўнасць нацыянальнай самасвядомасці, як прастора духоўнай культуры знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры, музыцы, быце, у абрадах. Яна фарміруе нацыянальна-культурнае аблічча кожнай асобы, надзяляе яе існаванне цэласнасцю і сэнсам, садзейнічае самавызначэнню і праяўленню яе здольнасцяў і магчымасцяў. Без Радзімы як грунтоўнай духоўнай каштоўнасці ўнутраны свет асобы ператварыўся б у мазаічную стракатую карціну разрозненых каштоўнасцей» [2, с. 14].

**Асноўная частка.** Выхаванне патрыятычных пачуццяў, фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўяўленняў аб гісторыі і культуры роднага краю, станоўчых адносін да яго з’яўляюцца аднымі з галоўных задач выхавання і навучання ва ўстановах дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі.

Сёння многія практычныя выхавальнікі дашкольнай адукацыі выказваюць думку аб тым, што неабходна звярнуцца да сваіх вытокаў, далучаць дашкольнікаў да беларускай нацыянальнай культуры, паглыблена знаёміць іх з родным краем, выхоўваць пачуццё грамадзянскасці і любові да малой радзімы.

Вялікую ўвагу пытанням арганізацыі работы па фарміраванні ўяўленняў аб родным краі, па выхаванні пачуцця гонару за Радзіму, беларускі народ, яго мову, гісторыю і культуру надзялялі педагогі-навукоўцы Дз. М. Дубініна, Н. С. Старжынкая, А. А. Грымаць і іншыя.

Раскрыць дзецям багацце і непаўторнасць роднага краю, яго гісторыю і культуру, дапамагчы ўсвядоміць і адчуць сябе яго неад’емнай часткай — галоўная задача дарослых. Патрыятычныя пачуцці не вы-

© Шыман Н. А., 2024



Репозиторий БарГУ

хоўваюцца пад прымусам, яны павінны ўвайсці ў сэрдца і думкі дзяцей непрыкметна, лёгка. А для гэтага выхавальніку дашкольнай адукацыі неабходна спалучаць разнастайныя формы і метады работы, якія б не прымушалі дзіця, а падштурхнулі да свядомага жадання пазнаваць гісторыю і культуру роднага краю, падзяліцца радасцю свайго ўспрымання новага з аднагодкамі і дарослымі. Дашкольны узрост — найбольш спрыяльны для гэтага перыяд.

Выхаванне патрыятычных пачуццяў ажыццяўляецца паступова, прытрымліваючыся прынцыпу — ад малога да вялікага. Пачынаць неабходна з выхавання шчырых адносін да сваіх родных. З гэтай мэтай арганізоўваліся розныя віды дзейнасці з дзецьмі, звярталася ўвага на клапатлівыя адносіны бацькоў да дзіцяці, на прафесіяналізм, умельства бацькоў, станоўчыя рысы іх характару: гутаркі: «Сем Я — сям'я», «Мой дом», «Адкуль пайшоў наш род? » і інш.; дыдактычныя гульні: «Хто галоўны? », «Як завуць членаў сям'і?», «Хто жыве ў кватэры? », «Складзі сям'ю з карцінак», «Маленькія памочнікі» і інш.; сюжэтна-ролевыя гульні: «Мая сям'я», «Збіраемся ў дзіцячы сад», «Дапаможам маме памыць бялізну», «Дзень нараджэння ў сям'і» і інш.; мастацкая дзейнасць: маляванне «Мая сям'я», «Дом, дзе я жыву», «Родныя краявіды»; разгладанне сямейных фотаздымкаў; чытанне твораў пра сям'ю.

Добрай падставай для выхавання патрыятычных пачуццяў з'яўляецца супрацоўніцтва з бацькамі. З дапамогай законных прадстаўнікоў арганізаваны забава «Сямейныя вячоркі», выстава сямейных фотаздымкаў, конкурс «Адкуль пайшоў наш род».

Прывіццё любові да сям'і — вельмі важная ўмова для патрыятычнага выхавання, бо менавіта адносіны бацькоў на навакольнага свету фарміруюць у дзіцяці першыя ўяўленні пра родныя мясціны.

Першапачатковыя ўяўленні пра нашу Радзіму — Рэспубліку Беларусь неабходна фарміраваць са знаёмства з "малой Радзімай" — вёскай, аграгарадком, горадам, дзе жыве дзіця. У адпаведнасці з Вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі дзеці дакладна знаёмяцца з гісторыяй свайго аграгарадка, даведваюцца пра паходжанне яго назвы. Знаёмства дашкольнікаў з месцам, дзе яны жывуць, узбагачае іх уяўленні, развівае цікавасць, садзейнічае выхаванню патрыятычных пачуццяў [3, с. 210].

Дзеці ўсведамляюць, што іх аграгарадок (сяло), лес, рачулка — частка вялікай Радзімы і кожная мясціна непаўторная па сваёй прыгажосці і гістарычных падзеях. Падчас мэтавых прагулак, экскурсій па родных мясцінах дзеці мелі магчымасць пазнаёміцца з гістарычнымі будынкамі, помнікамі архітэктуры, ставутымі мясцінамі малой радзімы і сучаснымі грамадскімі ўстановамі і іх прызначэннем. Дашкольнікі даведаліся пра назвы вуліц, іх паходжанне. Наведванне школьнага музея "Беларуская хатка", дзе сабраны розныя прадметы быту жыхароў аграгарадка, раскрыла дзецям багатыя традыцыі землякоў і таленавітае выкарыстанне іх сучаснымі майстрамі. На спецыяльна арганізаваных занятках выхаванцы пашырылі і замацавалі ўяўленні аб асаблівасцях жыцця беларускага народа ў мінулым: адзеннем, традыцыйнымі рамёствамі, прыладамі працы, нацыянальнымі стравамі. Былі складзены тэматычныя ілюстраваныя слоўнікі: «Беларускі посуд», «У гасцях у бабулі», «Нацыянальнае адзенне і абутак беларусаў».

З дапамогай бацькоў былі падрыхтаваны расказы пра гісторыю вуліц, на якіх яны жывуць, іх былыя назвы, прыгожыя будынкі. Гэта з'явілася падставай для захапляючай сумеснай дзейнасці бацькоў і выхаванцаў. Вялікая колькасць нагляднай інфармацыі (фотаздымкі, паштоўкі) спрыяла арганізацыі пазнавальнай гульні "Знаўцы малой радзімы", у ходзе якой дзеці атрымалі новыя веды пра гісторыю і культуру роднага краю.

Адначасова ішло знаёмства дашкольнікаў з прафесіямі дарослых, дзякуючы намаганням якіх аграгарадок набываў своеасаблівую прыгажосць. Гэта дало асазнанне таго, што ад кожнага жыхара залежыць будучыня роднага месца. Сумесна с дзецьмі і дарослымі былі праведзены акцыі «Зробім наш край чыстым і прыгожым», «Пасадзі дрэва».

Развіццё асобы дзіцяці ў грамадстве немагчыма без ведання роднай мовы. Менавіта ў дашкольным узросце фарміруецца цікавасць, патрэба да ведаў, якія адпавядаюць прыродным і індывідуальным задаткам выхаванцаў, закладваецца трывалы фундамент ведаў роднай мовы, якая з'яўляецца сувязным звяном у далучэнні дзяцей да гісторыі і культуры роднага краю, вытокаў народнай мудрасці. Праз чытанне і завучванне твораў мастацкай літаратуры на роднай мове выхаванцы ўспрымалі меладычнасць роднай мовы, выяўлялі выразныя сродкі мовы (эпітэты, параўнанні), эмацыянальна адгукаліся на мастацкія і народныя творы, якія цешаць нас не толькі сваёй прыгажосцю, мастацкім афармленнем, але заўсёды і абавязкова маюць выхаваўчае значэнне.

Унікальныя магчымасці для выхавання патрыятычных пачуццяў, азнаямлення з гісторыяй і культурай роднага края дае гульнявая дзейнасць дашкольнікаў. З вялікім задавальненнем выхаванцы ўдзельнічалі ў дыдактычных гульнях: «Жывёльны свет Беларусі», «Беларуская хатка», «Славутыя родныя мясціны», «Стракатая мазаіка»; гульнях-драматызацыях па сюжэтах вершаў, беларускіх народных казак, твораў беларускіх пісьменнікаў: Т. Кляшторная «Ветлівыя словы», М. Танк «Ехаў казачнік Бай», А. Якімовіч «Звяры нашых лясоў», «Зайкава хатка», «Пшанічны каласок», «Як курачка пеўніка ратавала»; народных гульнях: «Вузельчык», «Гарлачык», «Сляпы музыкант», «Грушка», «Лянок», «Пляцень» і іншых.

Вырашаючы задачы патрыятычнага выхавання, дашкольнікам неабходна даць дакладныя звесткі аб прыродных асаблівасцях Рэспублікі Беларусь. Выхавальнік імкнуўся да таго, каб дзеці ведалі не толькі назвы рэк, азёр сваёй мясцовасці, але і падкрэсліваў месца і ролю чалавека ў захаванні багаццяў роднай прыроды. З мэтай дзейнаснага характару адносін да прыроды выконваліся працоўныя даручэнні па догляду раслін, хатніх жывёл, разам з бацькамі былі арганізаваны прыродаахоўныя акцыі «Чыстая палянка», «Падсілкуйся, птушка».



Репозиторий БарГУ

Культура беларускага народа найбольш значна выяўлена ў абрадах, святах, звычаях, творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Актыўны ўдзел у святах «Гуканне вясны», «Дажынкі», «Купалле», «Калядкі» спрыяў далучэнню дашкольнікаў да народных традыцый, гісторыі роднага краю, узаемасувязі пакаленняў. Напярэдадні дзецям раскрываўся сэнс свята, былі завучаны вершы, песні, танцы, рыхтаваліся адпаведныя атрыбуты, касцюмы. Агульная радасная атмасфера ва ўстанове дашкольнай адукацыі ўзбагачала эмацыянальную сферу дашкольнікаў і дарослых, спрыяла лепшаму ўсведамленню жыцця і быту нашых продкаў.

**Заключэнне.** Агульныя намаганні ўстановы дашкольнай адукацыі і сям'і, сістэматычная, паслядоўная работа выхавальніка, выкарыстанне разнастайных метадаў і прыёмаў дапамагла данесці да выхаванцаў часцінку ведаў аб родным краі, аб гісторыі беларускага народа, абрадах і традыцыях, выхоўваць дзяцей добрымі, дапытлівымі і ўважлівымі да ўсяго, абуджаць веру дзіцяці ў тое, што ён вырасце патрэбным на зямлі чалавекам. Гэта і ёсць пачатак патрыятызму, які нараджаецца ў пазнанні, а фарміруецца ў працэсе паўсядзённага мэтанакіраванага выхавання.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Красіла, А. І.* Мой край завецца Беларуссю : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкол. адукацыі / А. І. Красіла. — Мазыр : Белы вецер, 2004. — 160 с.
2. *Грымаць, А. А.* Народная педагогіка беларусаў / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая. — Мінск : Выд. У. М. Скакун, 1999. — 256 с.
3. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск : НІА, 2023. — 367 с.



УДК 373.2



**Янова Юлия Константиновна**[1], **Ткач Любовь Тимофеевна**[2], *кандидат педагогических наук, доцент*
[1]*Муниципальное дошкольное образовательное учреждение № 28 «Улыбка»,*
*Тирасполь, Приднестровье, Республика Молдова, juliajanova@mail.ru*
[2]*Государственное образовательное учреждение «Приднестровский государственный университет*
*имени Т. Г. Шевченко», Тирасполь, Приднестровье, Республика Молдова, tkachlt@mail.ru*


## ЭТНОКУЛЬТУРНЫЙ КОМПОНЕНТ В СТРУКТУРЕ РАЗВИВАЮЩЕЙ ПРЕДМЕТНО-ПРОСТРАНСТВЕННОЙ СРЕДЫ ОРГАНИЗАЦИИ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ


В статье представлен опыт работы по использованию этнокультурного компонента содержания дошкольного образования в качестве фактора социализации дошкольника в поликультурном социуме на основе усвоения культурного наследия народа. Интерактивный мини-музей в структуре предметно-развивающей среды организации дошкольного образования представлен как средство развития инициативности и творческих способностей детей в процессе ознакомления с артефактами этнокультуры. Определено содержание поэтапной деятельности, составляющей алгоритм создания мини-музея в структуре предметно-развивающей среды организации дошкольного образования.



**Ключевые слова:** предметно-развивающая среда; этнокультурный компонент; активность; инициатива; социализация.



**Ianova Iulia Constantinovna**[1], **Tkach Lyubov Timofeevna**[2], *Candidate of Pedagogical Sciences, Associate Professor*
*Municipal Preschool Educational Institution No. 28 "Smile", Tiraspol, Pridnestrovian, the Republic of Moldova, juliajanova@mail.ru*
*Pridnestrovian State University named after T. G. Shevchenko, Tiraspol, Pridnestrovian, the Republic of Moldova, tkachlt@mail.ru*


## THE ETHNOCULTURAL COMPONENT IN THE STRUCTURE OF THE DEVELOPING SUBJECT-SPATIAL ENVIRONMENT PRE-SCHOOL EDUCATION ORGANIZATIONS


The article presents the experience of using the ethnocultural component of the content of preschool education as a factor of socialization of a preschooler in a multicultural society based on the assimilation of the cultural heritage of the people. The interactive mini-museum in the structure of the subject-developing environment of the organization of preschool education is presented as a means of developing the initiative and creative abilities of children in the process of familiarization with the artifacts of ethnoculture. The content of the step-by-step activity that makes up the algorithm for creating a mini-museum in the structure of the subject-developing environment of the organization of preschool education is determined.



**Key words:** subject-developing environment; ethnocultural component; activity; initiative; socialization.


**Введение.** Происходящие в современном обществе процессы пересмотра ценностного отношения к личностному становлению ребёнка как части окружающего его социума определяют те приоритетные задачи, которые призвана решать дошкольная педагогика. В Государственном образовательном стандарте дошкольного образования указывается на необходимость амплификации детского развития, приобщения «детей к социокультурным нормам, традициям семьи, общества и государства», учёта «этнокультурной ситуации развития детей и поликультурности образования», сохранения и развития «культурного разно-


© Янова Ю. К., Ткач Л. Т., 2024



Репозиторий БарГУ